Падтрымай "Вясну" на PATREON

Студэнцкія арганізацыі Беларусі бароняць Глеба Вайкуля

07.12.2015 **Тэгі**: свабода мірных сходаў



Глеб Вайкуль. Фота Радыё Свабода.

Кампанія па маніторынгу ціску на студэнтаў “Student Watch” распаўсюдзіла заяву ў падтрымку студэнта філалагічнага факультэта БДУ Глеба Вайкуля, які ўдзельнічаў у правядзенні Марша студэнтаў 2 снежня.

“3 снежня адміністрацыя філалагічнага факультэта БДУ выклікала на камісію студэнта філалагічнага факультэта БДУ Глеба Вайкуля, які ўдзельнічаў у правядзенні Марша студэнтаў, што прайшоў у Мінску 02.12.2015 г. Афіцыйная прычына выкліка Глеба – наяўнасць пропускаў, аднак мы разглядаем гэта як ціск на студэнта з за ягонага ўдзелу ў акцыі пратэста.

Мы, незалежныя студэнцкія арганізацыі, лічым элементам ціску дысцыплінарныя спагнанні любога характара “дэ-юрэ” за пропускі заняткаў, але “дэ-факта” за выказванне студэнтамі ўласнага меркавання і грамадзкую актыўнасць ў межах універсітэта. Такія дзеянні з’яўляюцца прамым парушэннем асноўных прынцыпаў Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі і абмяжаваннем акадэмічных свабод. У межах

заяўленага раней маніторынга мы будзем збіраць, аналізаваць і публікаваць інфармацыю пра ўсе факты ціска на студэнтаў у сувязі з іх грамадзянскай актыўнасцю, удзелам у руху “СтудэнтыСупраць” і іншых парушэннях акадэмічных свабод.

Мы вітаем дзеянні адміністрацыі філалагічнага факультэта БДУ, сябраў камісіі і ўсю адміністрацыю БДУ, якія ўстрымаліся ад жорсткага дысцыплінарнага пакарання ў дачыненні да студэнта БДУ Глеба Вайкуля. Мы шчыра спадзяемся, што адміністрацыя БДУ, іншых ВНУ г. Мінска і Беларусі, а таксама Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь праявяць прыхільнасць акадэмічным свабодам і устрымаюцца ад любых дысцыплінарных пакаранняў студэнтаў актывістаў”.

Заяву распаўсюдзіла “Кампанія па маніторынгу ціску на студэнтаў “Student Watch”, у якую ўваходзяць "Цэнтр развіцця студэнцкіх ініцыятыў" (Установа "ГЕДЭУС"), "Братэрства арганізатараў студэнцкага самакіравання" (Установа "Студэнцкая фабрыка думкі"), Моладзевая прафсаюзная група "Студэнцкая Рада", "Задзіночанне беларускіх студэнтаў".

Твитнуть







Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"




#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ
Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды атубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла аніжнальную стаку" Павел

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY